УДК 94(476)«1914/19»:323.329

П. В. Дзядзюля, дацэнт

# ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА І ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ БЕЛАРУСІ

The article reveals the tragedy of Belarus in the years of the First World War which caused the death of hundreds of thousands of people and made more than a million become refugees. The after-months of the war may have been more tragic if it were not for the activities of our national intellectuals who selflessly worked in refugee commissions and at children boarding schools, took care of the wounded, provided working places. For the needed, opened new schools where the teadring process was carried out in the native language. The intellectual elite believed in the future of Belarus, informed European peaples about the troubles of the Motherland and asked for help in building our own native state.

**Уводзіны.** Расійская палітычная эліта, ігнаруючы вопыт няўдалых для яе войн у нядаўнім мінулым, зноў увязалася ў яшчэ больш масштабны ваенны канфлікт з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй у нераўнапраўным саюзе з Англіяй і Францыяй. Ваенны міністр Расіі У. Сухамлінаў у пачатку 1914 г. з апломбам пісаў: «Не только армия, но и весь русский народ должен быть готов к мысли, что мы должны вооружиться для истребительной войны против немцев и что германские империи должны быть разрушены, хотя бы пришлось пожертвовать сотнями тысяч человеческих жизней» [1].

Характэрны інтэлект тагачасных царскіх міністраў. У трывожны для краіны час не знайшлося дальнабачных палітыкаў, якія змаглі б утрымаць агрэсіўную пасрэднасць і не дапусціць трагедыі. Загінулі не сотні тысяч жыхароў імперыі, а мільёны. І як вынік авантуры – глыбокі крызіс дзяржавы.

**Асноўная частка.** Першыя ахвяры ваеннага псіхозу ў Беларусі з'явіліся яшчэ ў час мабілізацыі запасных у дзеючую армію. Па прыгаворы ваенна-палявых судоў былі пакараны смерцю найбольш актыўныя пагромшчыкі панскіх маёткаў, піўных устаноў з ліку мабілізаваных у ліпені 1914 г. Паўсюдна праходзілі маніфестацыі, малебны, сходы, дзе гучалі заклікі да грамадзянскай згоды ў імя абароны айчыны, да ахвяр на карысць перамогі [2].

Малаадукаваны, а то і непісьменны беларус верыў многаму з таго, у чым яго пераконвалі царква, канцылярыя, чыноўнікі. І ў гэты ж час (з канца XIX і пачатку XX стст.) заметна вырасла колькасць нацыянальна свядомай інтэлігенцыі. Большасць з іх былі самаахвярнымі людзьмі, сапраўднымі патрыётамі Беларусі. У даваенны час, пераадольваючы забароны, палітычныя пераследы, абапіраючыся на дапамогу пэўнай часткі польскай, украінскай, рускай інтэлігенцыі, яны друкавалі беларускія кнігі, газеты, стваралі грамадска-палітычныя таварыствы, партыі, арганізоўвалі вечарыны, спектаклі.

Праз творчасць пісьменнікаў у народзе пашыраецца беларуская ідэя, распаўсюджваюцца веды па гісторыі.

Менавіта газета «Наша ніва» была адзінай у Паўночна-Заходнім краі, якая змясціла вершы Янкі Купалы, дзе быў выказаны погляд паэта на вайну. Вайна вядзецца не ў інтарэсах народа, яна нясе народам не згоду, волю і шчасце, а пагрозу гібелі і незлічоныя бедствы [3].

У гісторыі беларускай літаратуры і навукі унікальнае месца займае творчасць Міхайлы Грамыкі. Сын селяніна з Гомельшчыны, закончыў у 1911 г. Маскоўскі універсітэт, удзельнік рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг., член РСДРП, друкаваў вершы ў маскоўскіх выданнях. Як палітычна ненадзейны не змог атрымаць пасаду настаўніка ў Беларусі. Працаваў выкладчыкам у Адэсе, штогод прыязджаў улетку на Радзіму. У 1914 г. з групай настаўнікаў-турыстаў наведаў Германію, Італію, Швейцарыю. У Швейцарыі яго застала вестка пра пачатак вайны. Там, у Берне, і напісаў Міхайла Грамыка верш «З далекага тылу», у якім выказаў глыбокую трывогу за лёс чалавецтва, гнеўны праклён тым, хто распачаў сусветную крывавую бойню, заклапочанасць магчымымі бедамі Беларусі.

У 1921 г. М. Грамыка вярнуўся на Радзіму. Выкладаў у педтэхнікуме, БДУ, працаваў у Інбелкульце, Беларускай АН, прымаў удзел у пошуках нафты на Палессі. Быў аўтарам вершаў, паэм, драматычных твораў, падручнікаў. 13 ліпеня 1930 г. арыштаваны НКУС, паўтарыў лёс большасці беларускай інтэлігенцыі: высылка ў расійскую глыбінку, кляймо «вораг народа», фізічныя і маральныя пакуты [4].

«Наша ніва» у № 37 за 18 верасня 1914 г. змяшчае артыкул «Нашы пісьменнікі і грамадскія працаўнікі на вайне», у якім называюцца імёны тых, хто быў мабілізаваны ў армію. Сярод іх Якуб Колас, Максім Гарэцкі, публіцыст Лявон Гмырак, паэт А. Гурло, старшыня Віленскага Беларускага музычна-драматычнага гуртка Б. Даніловіч, юрыст Г. Царык, студэнт-медык С. Луцкевіч і інш. Рэдакцыя жадае, каб яны цэлымі і здаровымі вярнуліся з вайны ў родную старонку, якой так патрэбны працоўныя рукі на ніве грамадзянскай работы [5].

Не маглі ведаць нашаніўцы ў той час, што вайна прынясе жахлівыя страты. Загінуць ці будуць пакалечаны сотні тысяч жыхароў Беларусі, звыш 2 млн. чалавек стануць бежанцамі [6]. Найбольш адчувальнымі для краю была гібель

часткі яшчэ пераважна маладой інтэлігенцыі. 30 чэрвеня 1915 г. у баях пад крэпасцю Коўна загінуў 24-гадовы, таленавіты публіцыст, крытык Л. Гмырак. Згубіўся ў віхуры вайны малады здольны паэт, перакладчык М. Арол, якога высока цаніў М. Багдановіч.

Самы яркі, драматычны след сусветная вайна пакінула ў жыцці і творчасці таленавітага Максіма Гарэцкага. Ён быў цяжка паранены ва Ўсходняй Прусіі яшчэ ў пачатку вайны. Пасля выздараўлення зноў трапіў на фронт у раён Пінска. У 1917 г. небяспечна захварэў і канчаткова звольніўся з вайсковай службы [7]. Бесчалавечная жорсткасць, бессэнсоўнасць вайны была для яго добра зразумелай. Ён як ніхто іншы бачыў кроў на фронце, пакуты жанчын, дзяцей, старых, голад, хваробы, бежанскія абозы ў невядомасць. Жывым сведкам, чалавечым дакументам пра вайну, як і творы яго сучаснікаў Анры Барбюса «Агонь», Эрыха Марыі Рэмарка «На Заходнім фронце без зменаў», Эрнста Хэмінгуэя «Бывай, зброя!», стала аповесць М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне». Гарэцкі паказвае жахі франтавого побыту, якія паўтараюць падобныя апісанні яго еўрапейскіх калег, што сведчыць аб назіральнасці і глыбіні разваг аўтара. Думка пра народ, які ўстае з каленяў, узвышае галоўнага героя твора Лявона Задуму над падзеямі і ўласным лёсам, яго хвалююць пытанні: «А ці вызваліцца мой народ? Што яму дасць гэта вайна?» Яго падтрымлівае вера: «І не дарэмна мы тут ваюем – да нечага даваюемся. І калі тут не заб’юць, то надыдзе пара – паваюем і за нешта другое» [8].

Дыяпазон творчай дзейнасці М. Гарэцкага надзвычай шырокі. Мастацкая проза, журналістыка, гісторыя літаратуры, выкладчыцкая дзейнасць. Прырода шчодра адарыла М. Гарэцкага талентам. І ён, нібыта прадчуваючы свой кароткі век, працаваў як апантаны. Шмат чаго яшчэ мог бы зрабіць для свайго народа гэты унікальны чалавек.

Найвялікшай бядой беларусаў было бежанства. Мірнае насельніцтва з набліжэннем фронту прымусова высялялася з родных хат у блізкі і далёкі тыл. Па дарозе на ўсход людзі хварэлі, галадалі, паміралі. Сотні магіл заставаліся ўздоўж гасцінцаў.

Ход вайны не дабаўляў аптымізму. Расійская армія несла вялікія страты. Колькасць абяздоленных расла. Інтэлігенцыя як найбольш свядомая частка грамадства пачала актыўна ствараць дабрачынныя бежанскія таварыствы. Найбольш дзеяздольнымі з іх былі ў Петраградзе, Вільні, Мінску. У Расійскай сталіцы ў гэты час была самая вялікая беларуская дыяспара.

Заснавалі таварыста і актыўна працавалі ў ім Б. Энімах-Шыпіла, Б. Тарашкевіч, А. Ярэмчык, Ч. Родзевіч, З. Жылуновіч і інш. Землякоў падтрымлівалі матэрыяльна і маральна сотні беларусаў, якія жылі ў Петраградзе і ў навакольных паселках. Таварыства аказвала дапамогу грашыма і рэчамі, адкрыла інтэрнаты для беларускіх студэнтаў і вучняў, дзіцячы прытулак, кравецкую майстэрню, выдавала лістоўкі з заклікамі ахвяраваць грошы для бежанцаў.

Але беларускую інтэлігенцыю у Петраградзе хвалявалі і праблемы духоўнага адраджэння народа. П. Мядзёлка успамінала, як кожную суботу вечарамі збіралася беларуская моладзь на квартэры прафесара Б. Энімах-Шыпілы. Сюды заходзілі жывапісец Я. Драздовіч, збіральнік беларускіх народных песень А. Грыневіч, кампазітар С. Казура, інжынеры, аграномы. Б. Тарашкевіч чытаў даклад аб асновах беларускай граматыкі, хтось выступаў з рэфератамі па гісторыі і эканоміцы Беларусі. Я. Драздовіч расказваў аб стылі старадаўніх касцёлаў, цэркваў і іншых помнікаў архітэктуры. З. Жылуновіч прыносіў падпольную рэвалюцыйную літаратуру, гаварыў аб рабочым руху на заводах [9].

Аналагічная арганізацыя была заснавана ў красавіку 1915 г. у Вільні. У розны час у ёй працавалі А. Луцкевіч, В. Ластоўскі, В. Іваноўскі, Я. Салавей і інш. Таварыства арганізоўвала пункты харчавання, сталовыя, інтэрнаты. Сродкі складаліся з членскіх узносаў, ахвяраванняў, прыбыткаў з дабрачынных мерапрыемстваў. Арганізацыя аказвала не толькі матэрыяльную дапамогу ахвярам вайны, але гуртавала вакол сябе дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, што засталіся ў Вільні.

Праводзілася шырокая культурна-асветная дзейнасць сярод дарослых і дзяцей. Для арганізацыі беларускіх школ была створана камісія. Яе намаганнемі 13 лістапада 1915 г. у Вільні пачала працу першая беларуская пачатковая школа, а ў 1916 г. у горадзе дзейнічала 5 беларускіх школ. Навучанне было бясплатным, бедных вучняў таварыства забяспечвала аддзеннем і харчаваннем. Школьная камісія распрацоўвала навучальныя праграмы, прызначала настаўнікаў, выдавала падручнікі.

Вясной 1916 г. адбыўся першы выпуск слухачоў беларускіх настаўніцкіх курсаў, арганізаваных школьнай камісіяй у снежні 1915 г. у Вільні. У канцы 1916 г. у мястэчку Свіслач пачала працаваць беларуская настаўніцкая семінарыя. Падрыхтоўка настаўнікаў дазволіла значна пашырыць школьную адукацыю. На працягу 1917–1918 гг. на акупіраваных тэрыторыях былі адкрыты 153 беларускія пачатковыя школы [10].

Мінск у першыя месяцы вайны стаў амаль прыфрантавым горадам. Размяшчаліся тут тысячы вайскоўцаў, работнікаў тылу. І ў той жа час ілюзія вялікага і заможнага горада прыцягвала ў Мінск дзесяткі тысяч бежанцаў. І калі ў 1914 г. тут пражывала 100 тыс., то ў 1915 г. – ужо 250 тыс. чалавек [11].

Забеспячэнне таварамі насельніцтва было недастатковым. Спекулятыўныя цэны, чэргі, мізэрныя заробкі, беспрацоўе вялі да голаду. Інтэлігенцыя Мінска яшчэ летам 1916 г. стварыла Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Кіраўніком яго стаў адвакат В. Чаусаў, здольны арганізатар. Яго падначаленнымі былі Ф. Шантыр, З. Верас, З. Бядуля, Ядвігін Ш., А. Паўловіч, У. Фальскі, У. Галубок, А. Смоліч і інш. Таварыства арганізавала некалькі сталовак, начлежак, пункт медыцынскай дапамогі, стварыла дзесяткі рабочых месцаў для беспрацоўных, вазіла на аздараўленне дзяцей у маёнтак Карпілоўка, які належаў Ядвігіну Ш.

Думаючы пра пасляваенны час, члены таварыства наладзілі агародніцка-пчалярскія курсы для бежанцаў з мэтаю падрыхтаваць іх да аднаўлення знішчаных гаспадарак.

Вялікай падзеяй для мінскай інтэлігенцыі быў прыезд у горад М. Багдановіча ў верасні 1916 г. Цяжка хворы паэт, прадчуваючы непапраўнае, хацеў пажыць у Мінску, у сваім родным горадзе, дыхнуць паветрам Бацькаўшчыны, пачуць жывую беларускую мову. Шмат пісаў, рыхтаваўся да напісання чытанкі-хрэстаматыі для дзетак [12]. М. Багдановіч часта наведваў так званую «Беларускую хатку», дзе размяшчалася сталовая для бежанцаў, працавала бібліятэка, якая стала своеасаблівым клубам беларускай інтэлігенцыі. У адзін з вечароў канца 1916 г. паэт напісаў тут знакамітую «Пагоню». Гэта быў як бы запавет, зварот да беларусаў берагчы Радзіму, што ў які ўжо раз у сваёй гісторыі перажывала трагічныя часы [13].

На акупіраваных немцамі тэрыторыях Беларусі і Літвы ўзнаўлялася палітычная дзейнасць. Група інтэлігенцыі краю стварыла Канфедэрацыю Вялікага княства Літоўскага. 9 снежня 1915 г. быў апублікаваны універсал канфедэрацыі, у якім аб'яўляліся мэты арганізацыі і быў сфармуляваны зварот да ўсіх нацый, арганізацый і грамадзян з заклікам далучыцца да іх.

Амаль адначасова ў Вільні дзейнічалі Беларускі народны камітэт і Сувязь незалежнасці і непадзельнасці Беларусі. Сярод арганізатараў і ўдзельнікаў палітычных груповак былі А. Луцкевіч, В. Ластоўскі, В. Святаполк-Мірскі, К. Шафпагель і інш. Вядомыя інтэлектуалы, дасведчаныя ў тагачаснай палітыцы, патрыёты краю імкнуліся гуртаваць сілы, каб у пасляваенны час знайсці шляхі да будаўніцтва нацыянальнай дзяржавы.

Сведчаннем росту палітычнай актыўнасці беларусаў з'явіўся ўдзел іх прадстаўнікоў (А. Луцкевіча і В. Ластоўскага) ў міжнародных канферэнцыях у красавіку 1916 г. у Лазане (Швейцарыя) і ў студзені 1917 г. у Стакгольме (Швецыя). Там упершыню ў навейшай гісторыі паднімалася пытанне аб палітычнай і культурнай аўтаноміі для Беларусі ў складзе Расійскай дзяржавы [14].

**Заключэнне.** Кароткі аналіз супярэчлівага, складанага перыяду нашай гісторыі сведчыць пра значны інтэлектуальны, палітычны, арганізацыйны патэнцыял народа і найперш яго інтэлігенцыі. Ён яшчэ не раз праявіць сябе ў бліжэйшай і далёкай перспектыве.

## Літаратура

1. Милюков, П. Н. Воспоминания: в 2 т. / П. Н. Милюков. – М.: Современник, 1990. – Т. 2 (1859–1917). – С. 148.

2. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. М. П. Касцюка. – Мінск, Беларусь, 1994. – Ч. 1. – С. 441–442.

3. Янка Купала. Збор твораў: у 7 т. / Янка Купала. – Мінск: Навука і тэхніка,1972–1976. – Т. 3. – С. 267–280.

4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, БелЭн, 1996. – Т. 3. – С. 116.

5. Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы / Г. В. Кісялёў (укладальнік). – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – С. 93–94.

6. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 473.

7. Бугаёў, Д. Арыгінальны мастак: прадмова / Д. Бугаёў // Гарэцкі, М. Выбраныя творы: у 2 т. / М. Гарэцкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1973. – Т. 1. – С. 9.

8. Баршчэўскі, Л. Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярные нарысы / Л. Баршчэўскі, П. Васючэнка, М. Тычына. – Мінск: Радыёла-плюс, 2006. – С. 213.

9. Мядзёлка, П. В. Сцежкамі жыцця / П. В. Мядзёлка // Мастацкая літаратура. – Мінск, 1974. – С. 89–91.

10. Юры Туронак. Мадэрная гісторыя Беларусі / Юры Туронак. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2006. – С. 519–522.

11. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі / З. Шыбека. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2003. – С. 178.

12. Верас, З. З дзённікавы запісаў. З жыцця Максіма Багдановіча / З. Верас // Бацькаўшчына: зб. гістарычнай літарутары. – Мінск, Юнацтва, 1992. – С. 128, 136–139.

13. Шыбека, З. Прэм'ера Максімавай «Пагоні»: / З. Шыбека // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Мінска: у 4 кн. – Мінск: Белта: 2001–2005. – Кн. 2. – С. 261–262.

14. Мірановіч, Я. Найноўшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – С. 27.